## НАШЕ НАСЛЕДИЕ

**С. Я. Новікаў**

# АД ДУБОВЫХ КРЭСЛАЎ ДА ІНТЭРАКТЫЎНЫХ ДОШАК: АРХІТЭКТУРНАЯ ГІСТОРЫЯ МДЛУ[1]

В статье автор продолжает исследование истории МГПИИЯ на примерах изучения документальных фактов от выделения земельного участка, разработки генерального плана застройки, отбора наиболее удачных проектных эскизов и до создания уникальной архитектурно-художественной композиции зданий университетского комплекса. Формирование сегодняшнего архитектурного вида учебных корпусов и сооружений действующего ныне учреждения образования растянулось на несколько десятилетий и завершилось лишь в начале текущего века. Благодаря стратегическому планированию руководства института (университета) и творческой реализации архитекторских проектов, в центре белорусской столицы создан один из самых современных образовательных комплексов учебных зданий и сооружений Минского государственного лингвистического университета, в будущем – Белорусского государственного университета мировых языков и культур.

Вывучэнне новых дакументальных крыніц па гісторыі МДПІЗМ – МДЛУ з фондаў Беларускага дзяржаўнага архіва навукова-тэхнічнай дакументацыі[2] (БДАНТД) дазваляе выявіць малавядомыя факты гісторыі будаўніцтва вучэбных карпусоў сучаснага ўніверсітэцкага комплексу, што да гэтага часу спецыяльна не вывучалася [1, с. 220; 2, с. 232; 3, с. 220]. Прадметам нашага даследавання вылучаны архітэктурна-канструктарскія рашэнні забудовы лінгвістычнай установы адукацыі, якія гістарычна вынікалі з задач падрыхтоўкі генеральнага плана, праектнай распрацоўкі вертыкальнай і гарызантальнай кампазіцый карпусоў і збудаванняў і творчага пошуку калектыву архітэктараў па знешнім аздабленні будынкаў, іх рацыянальнай прывязцы і фарміраванні кампактнай унутранай прасторы.

Важным крокам на гэтым шляху стала пастанова № 1686 Савета Міністраў Беларускай ССР ад 26 лістапада 1947 г. «Аб падрыхтоўцы выкладчыкаў замежных моў», паводле якой Галоўнаму ўпраўленню па аднаўленні горада Мінска аддавалася распараджэнне пачаць работы па падрыхтоўцы да эксплуатацыі з 1 верасня 1948 г. будынка былога Камуністычнага інстытута

[1] За прафесійную кансультацыю аўтар выказвае шчырую падзяку Ігару Іванавічу Есьману (якому ў бягучым годзе спаўняецца 85 гадоў з дня нараджэння) – архітэктару, члену-карэспандэнту Акадэміі архітэктуры Рэспублікі Беларусь, распрацоўшчыку праектных заданняў па пабудове двух вучэбных карпусоў (А і В) і комплексу актавай і спартыўных залаў МДЛУ

[2] Аўтар матэрыялу ўдзячны загадчыку аддзела інфармацыі і выкарыстання дакументаў Беларускага дзяржаўнага архіва навукова-тэхнічнай дакументацыі кандыдату гістарычных навук С. В. Кулінку за інфармацыйную падтрымку.

журналістыкі[1], які размяшчаўся на рагу вуліц Кірава і Чырвонаармейскай [4, арк. 136]. У сувязі з тым, што гэта пастанова не набыла сілы, больш таго, узнікла рэальная пагроза адтэрміноўкі яго рэалізацыі, Савет Міністраў Беларускай ССР выносіць ў ліпені 1948 г. новае ўрадавае рашэнне «Аб мерах, якія забяспечваюць выкананне пастановы Савета Міністраў Саюза ССР № 3485 ад 4 кастрычніка 1947 г. "Аб падрыхтоўцы выкладчыкаў замежных моў"» [5, арк. 56–57]. Згодна з ім беларускі ўрад у рамках саюзнай праграмы па адкрыцці 12 інстытутаў замежных моў упершыню прымае рашэнне аб будаўніцтве асобнага вучэбнага корпуса для Мінскага педагагічнага інстытута замежных моў. Пры гэтым пастановай прадугледжвалася, што часова, да завяршэння будаўніцтва, інстытут будзе размяшчацца ў будынку школы № 13 па вул. Пушкіна, 35[2]. Апроч таго, інстытуту ў якасці інтэрнатаў для студэнтаў перадаваліся будынкі былой дашкольнай установы па вул. Віцебская, 9, якую часова займаў Беларускі дзяржаўны ўніверсітэт, а таксама будынак былой школы № 24 па вул. Энгельса, дзе на той момант размяшчаўся Белдзяржпраект [5, арк. 56].

Першае планавае заданне на праектаванне вучэбнага корпуса па вул. Захарава дырэктар інстытута замежных моў М. Ф. Жаўрыд накіроўвае на імя міністра асветы Беларускай ССР І. М. Ільюшына 7 чэрвеня 1952 г. [6, арк. 18–24]. Гэтым дакументам прадугледжвалася архітэктурная распрацоўка будынка з улікам навучання ў ім у адну змену чатырох факультэтаў агульнай колькасцю 1 200 чалавек, з якіх 500 студэнтаў – на факультэце нямецкай мовы, 400 – англійскай, 200 – французскай і 100 – іспанскай. Наступнай умовай, згаданай у планавым заданні, было тое, што гэта будзе 4-павярховы будынак, размешчаны па вул. Захарава, дзе планавалася размясціць наступныя кафедры: асноў марксізму-ленінізму, педагогікі, псіхалогіі, мовазнаўства, літаратуры, геаграфіі і гісторыі, фізкультуры, а таксама бібліятэку. Апроч таго, факультэты англійскай мовы з 4 аўдыторыямі, дзвюма кабінетамі, двума кафедрамі, кабінетам дэкана і канцылярыяй дэканата; французскай мовы з 4 аўдыторыямі, двума кабінетамі і кафедрай французскай мовы, кабінетам дэкана і канцылярыяй дэканата; факультэта нямецкай мовы з 4 аўдыторыямі, двума кабінетамі і кафедрай нямецкай

[1] Аўтар шчыра ўдзячны апантанаму экскурсаводу, члену Камісіі па перайменаванні вуліц горада Мінска пры Мінгарвыканкаме, асістэнту кафедры эканамічнай гісторыі УА «Беларускі дзяржаўны эканамічны ўніверсітэт» І. І. Сацукевічу за прафесійную дапамогу.

[2] Да 1952 г. вул. Пушкіна знаходзілася на ўчастку ад Камароўскай плошчы (сёння Плошча Якуба Коласа) да Парка Чэлюскінцаў.

Падчас вывучэння пытання аб месцы размяшчэння будынка сярэдняй школы № 13 па вул. Пушкіна, 35 быў прааналізаваны генеральны план гарадской забудовы 1948 г. на перасячэнні з Шостай лініяй (так называлася сучасная вул. Дарашэвіча) і высветлены факт таго, што да нашага часу будынак гэтай школы не захаваўся ў якасці гістарычнага аб'екта горадабудаўніцтва. Аўтар шчыра ўдзячны прафесару кафедры гісторыі, сусветнай і айчыннай культуры УА «Беларускі нацыянальны тэхнічны ўніверсітэт» К. І. Баландзіну за дапамогу ў праверцы гэтага гістарычнага факта.

мовы, кабінетам дэкана і канцылярыяй дэканата; факультэта іспанскай мовы з 3 аўдыторыямі, кабінетам і кафедрай іспанскай мовы. Для дырэктара інстытута, яго намеснікаў (па вучэбнай частцы, завочным навучанні, адміністрацыйна-гаспадарчай частцы) і размяшчэння іншых службаў інстытута былі запланаваны 25 памяшканняў плошчай звыш 600 м$^2$ [6, арк. 19–23].

У кастрычніку 1952 г. на імя міністра асветы БССР за подпісам выконваючага абавязкі дырэктара інстытута А. А. Сарокіна было накіравана планавае заданне на пларіровачную прывязку тыпавога праекта інтэрната на 400 чалавек да Омскага завулка[1] [7, арк. 25]. Заданнем прадугледжвалася распрацоўка генплана з улікам таго, што акрамя інтэрната на 400 чалавек інстытут плануе праектаванне і размяшчэнне будынка вучэбнага корпуса на 1 200 студэнтаў і 24-кватэрнага жылога дома для супрацоўнікаў МДПІЗМ, а таксама неабходна было прадугледзець распрацоўку адпаведнай вертыкальнай планіроўкі і добраўпарадкавання прылеглага да будынка зямельнага ўчастка.

Праз 2 гады Беларускі дзяржаўны праектны інстытут «Белдзяржпраект» падрыхтаваў праектнае заданне з архітэктурным апісаннем будынка інстытута замежных моў у г. Мінску [8, арк. 6–17]. Аўтарам першага праекта з’яўляўся архітэктар Г. У. Заборскі, адзін з распрацоўшчыкаў манумента Перамогі на Круглай (Перамогі) плошчы, а таксама планіроўкі і архітэктурнай забудовы гэтага раёна Мінска [9]. З тлумачальнай запіскі да праектнага задання па будынку будучага інстытута вынікала, што на той час на адведзеным участку па Омскім завулку ўжо вялося будаўніцтва інтэрната інстытута, у двары якога былі запраектаваны стадыён, валейбольная пляцоўка, дарожкі, клумбы і газоны. Праектавалася, што да цэнтральнага ўваходу галоўнага фасада з боку вул. Захарава будзе весці парадная лесвіца, аформленая скульптурамі Сталіна і Леніна на п’едэсталах, а перад самім будынкам на адлегласці 18 м ад агароджы планавалася пляцоўка для адпачынку студэнтаў інстытута.

Рашэнне ўнутранай прасторы інстытута ў выкананні Г. У. Заборскага фарміравалася з улікам наступнага паверхавага размяшчэння запланаваных памяшканняў: на першым паверсе – адміністрацыя інстытута, памяшканні грамадскіх арганізацый, спартыўная зала і буфет; на другім – кафедры педагогікі, псіхалогіі, агульнага мовазнаўства, геаграфіі і гісторыі, французскай мовы. На другім паверсе – актавая зала на 512 чалавек з эстрадай і кінабудкай. На трэцім паверсе – кафедры асноў марксізму-ленінізму, іспанскай і нямецкай моў, лекцыйныя аўдыторыі на 144 і 221 чалавек, а таксама пакоі для прафесараў і выкладчыкаў; на чацвёртым паверсе – кафедра англійскай мовы. На цокальным паверсе планавалася размясціць бібліятэчны комплекс.

[1] Да 1988 г. завулак называўся Омскім (былы 1-ы Шпітальны), да 90-годдзя правядзення I з’езда РСДРП у Мінску перайменаваны ў вуліцу Пятра Румянцава (згодна з 1960-е и дальше… [Электронны рэсурс]. – Рэжым доступу : https://minsk-old-new.com/vinsk-2912.htm. – Дата доступу : 06.02.2017).

Упрыгожваў будынак багата развіты карніз з мадульёнамі. Сярод адметнасцяў варта згадаць заказ інстытута на забеспячэнне працоўных памяшканняў мэбляй, сярод якой – 680 дубовых сталоў і 2 020 дубовых крэслаў [8, арк. 7].

У маі 1955 г. дырэктар інстытута замежных моў М. Жаўрыд накіроўвае на імя міністра асветы БССР І. М. Ільюшына планавае заданне на прывязку тыпавога праекта Індустрыяльнага тэхнікума на 840 чалавек (франтальнае рашэнне) для вучэбнага корпуса інстытута, у якім хадайнічае аб унясенні ў генплан дадатковага задання, звязанага з неабходнасцю пабудовы 40-кватэрнага жылога дома для супрацоўнікаў установы вышэйшай адукацыі [10, арк. 11]. Заўважым, што тыпавы праект тэхнікума толькі годам раней быў распрацаваны Маскоўскім дзяржаўным інстытутам па праектаванні вышэйшых навучальных устаноў[1] (ГІПРАВУЗ).

Падрыхтоўка «Праекта вертыкальнай планіроўкі і ўпарадкавання тэрыторыі Інстытута замежных моў па вул. Захарава ў г. Мінску» [11, арк. 1] перададзена ў майстэрню аб’ёмнага праектавання дзяржаўнага праектнага інстытута «Мінгарпраект». Згодна з праектам, распрацаваным да канца снежня 1955 г., у пераліку аб’ектаў перспектыўнай забудовы былі пазначаны: асобны вучэбны корпус інстытута па вул. Захарава, корпус інстытута з размяшчэннем актавай і спартыўных залаў на рагу вул. Захарава і Омскага завулка і 32-ы жылы дом на рагу вул. Захарава і Вайсковага завулка. На ўнутранай тэрыторыі было вызначана месца для спартыўных пляцовак (для гульняў у баскетбол, валейбол, тэніс) а таксама для службовых збудаванняў. Асновай архітэктурна-канструктарскага задання па праектаванні будынка для інстытута замежных моў у г. Мінску быў выбраны праект будынка Індустрыяльнага тэхнікума (франтальнае рашэнне) на 840 чалавек [12, арк. 9],




Фота 1. Будынак МДПІЗМ ў кантэксце забудовы раёна Плошчы Перамогі (1958 г.)

[1] Існаваў як вядучая праектная ўстанова для архітэктурна-праектнай распрацоўкі дакументацыі для ўстаноў вышэйшай адыкацыі СССР з 1947 па 1991 г.

Пасля ўвядзення ў строй 1 верасня 1958 г. вучэбнага корпуса па вул. Захарава (фота 1[1]) кіраўніцтва інстытута ўносіць важныя карэктывы ў генеральны план забудовы тэрыторыі, што было замацавана рашэннем Мінгарвыканкама № 112 ад 16 сакавіка 1961 г. [13, арк. 12–13]. Выканкам Мінскага гарадскога Савета дэпутатаў працоўных прыняў рашэнне аб павелічэнні на 0,32 га зямельнага ўчастка інстытута за кошт тэрыторыі на рагу вул. Захарава і Омскага завулка ў сувязі з яе неасваеннем Мінскім педагагічным інстытутам імя М. Горкага, што дазваляла правесці прыбудову да тарца будынка вучэбнага корпуса па вул. Захарава. Павелічэнне зямельнага ўчастка інстытута, з аднаго боку, а таксама правядзенне вучэбных заняткаў у тры змены ў новым будынку ставілі ў пачатку 1960-х гадоў на парадак дня пытанне аб пераглядзе папярэдняй канцэпцыі і ўнясенні ў генеральны план забудовы істотна важных змен, скіраваных кіраўніцтвам інстытута на адбудову не аднаго, а двух вучэбных карпусоў: на рагу вул. Захарава і Омскім завулку адпаведна, а таксама вул. Захарава і Вайсковым завулку. Новыя праектныя чарцяжы былі распрацаваныя архітэктарам «Мінскпраекта» І. І. Есьманам на аснове праектнага задання, зацверджанага Упраўленнем па справах будаўніцтва і архітэктуры Мінгарвыканкама 23 чэрвеня 1963 г. [14, арк. 7].

У планавым заданні, накіраваным на імя міністра вышэйшай, сярэдняй спецыяльнай і прафесійнай адукацыі БССР М. В. Дарашэвіча рэктарам інстытута Ф. П. Шмыгавым у пачатку студзеня 1962 г., згадвалася перспектыва навучання ў МДПІЗМ у сярэдзіне 60-х гадоў 2 500 студэнтаў толькі на дзённай форме. У гэтай сувязі рэктарат хадайнічаў аб дазволе на прыбудову вучэбнага корпуса інстытута, у якім неабходна было прадугледзець актавую залу на 800 чалавек са сцэнай, бібліятэку, дзве чытальныя залы (у тым ліку для 120 студэнтаў і залу для 50 навуковых работнікаў), а таксама 9 аўдыторый (у тым ліку 5 паточных для агульнай колькасці ад 75 да 150 студэнтаў), 4 аўдыторыі на 50 чалавек, 8 – на 25 студэнтаў, 40 – для груп колькасцю не больш за 15 чалавек, а таксама залу для заняткаў фізічнай культурай і 3 кабінеты. Пры гэтым у планавым заданні адзначалася, што інстытут мае намер цалкам захаваць у сваім распараджэнні вучэбны корпус па вул. Захарава [15, арк. 6].

У адпаведнасці з вышэй згаданым рашэннем Мінгарвыканкама дзяржаўны праектны інстытут «Мінгарпраект» пачаў распрацоўку двух новых вучэбных корпусаў і комплексу з актавай і спартыўнай заламі, даручыўшы выконваць праектнае заданне маладому архітэктару І. І. Есьману [16]. Паводле новага генплана, распрацаванага на працягу 1962 г., былі ўнесены змены, якімі замест запланаванага папярэдне 32-кватэрнага жылога дома прадугледжвалася ўзвядзенне новага вучэбнага корпуса [17, арк. 1; 18, арк. 1]. У адпаведнасці з планіровачным рашэннем Мінгарвыканкама на рагу

[1] Аўтар выказвае падзяку дацэнту кафедры гісторыі, сусветнай культуры і турызму МДЛУ, кандыдату гістарычных навук А. Г. Цымбалу за практычную дапамогу ў апрацоўцы наглядных матэрыялаў і электроннай падрыхтоўцы іх да друку.

вул. Захарава і Вайсковым завулку паўставаў 6-павярховы будынак з бібліятэкай і кнігасховішчам. На рагу вул. Захарава і Омскім завулку праектаваўся корпус з актавай і спартыўнай заламі (фота 2, 3) [19, арк. 27].



Фота 2. Макет будынкаў МДПІЗМ архітэктара І. І. Есьмана (1962 г.)



Фота 3. Макет карпусоў МДПІЗМ архітэктара І. І. Есьмана (1962 г.)

Пасля завяршэння будаўнічых работ і ўвядзення ў 1964 г. вучэбнага корпуса на Омскім завулку І. І. Есьман распрацоўвае архітэктурна-будаўнічую дакументацыю на вучэбны корпус па Вайсковым завулку. Як і ў вучэбным корпусе па Омскім завулку, 32-гадовы архітэктар шукае новыя рашэнні злучэння вучэбных карпусоў па вул. Захарава з дапамогай аднапавярховага вестыбюля [20, арк. 6]. Праектная частка была распрацавана з улікам размяшчэння ў корпусе наступных памяшканняў: 36 аўдыторый на 14 чалавек, 4 аўдыторыі на 25 чалавек, 8 аўдыторый на 65 чалавек, 4 аўдыторыі на 104 чалавекі, 1 аўдыторыя для паказу кінафільмаў на 247 чалавек, 6 аўдыторый для індывідуальных заняткаў. Ва ўсіх памяшканнях планаваліся паркетныя палы і шырокія вокны [19, арк. 8]. Узвядзенне будынка, распачатае ў 1965 г., было праз год паспяхова завершана. Добра папрацавалі студэнты МДПІЗМ у трэцім працоўным семестры на будаўніцтве новага вучэбнага корпуса [21, арк. 53].

Паводле генплана вучэбны корпус па вул. Захарава з будынкамі двух новых вучэбных корпусаў (на рагу вул. Захарава і Вайсковага і Омскага завулкаў) і корпуса са спартыўнай і актавай заламі стварылі комплекс карпусоў і збудаванняў інстытута. Заўважым, што апошні будаўнічы аб’ект на працягу трох гадоў распрацоўваў галоўны архітэктар «Мінскпраекта» І. І. Есьман. Для будучай забудовы архітэктарам было прапанавана зусім іншае планіровачнае рашэнне ў параўнанні з тымі, якія актыўна абмяркоўваліся ў калектыве архітэктараў у пачатку 1960-х гадоў. Паводле тлумачальнай запіскі комплекс з актавай і спартыўнай заламі размяшчаўся на новым месцы ў двары і прымыкаў да ўжо існуючага вучэбнага корпуса па вул. Захарава. Актавая зала на 800 месцаў мела даўжыню больш за 25 м. На пласцікатным экране памерам 12,4 x 5,3 м маглі дэманстравацца звычайныя, кашэціраваныя і шырокаэкранныя фільмы [22, арк. 11; 23, арк. 1].

Паводле слоў архітэктара І. І. Есьмана, унікальнасць пабудовы новых вучэбных карпусоў выявілася ў тым, што ў будаўніцтве грамадзянскіх збудаванняў упершыню былі выкарыстана прамысловыя напрацоўкі (фота 4, 5), што стала магчымым дзякуючы рацыяналізатарскай прапанове кіраўніка архітэктурна-канструктарскай майстэрні «Мінскпраекта» архітэктара Н. І. Шпігельмана. У выніку гэтага былі спалучаны перадавыя тэхналогіі, якія на той час выкарыстоўваліся ў прамысловай архітэктуры, значна паскорана ўзвядзенне карпусоў грамадзянскага будаўніцтва, якія набывалі арыгінальнае архітэктурнае і мастацкае вырашэнне. Сярод знаходак архітэктар называе таксама канструкцыю акон, вопыт выканання якіх быў запазычаны з Літвы. Вокны мелі вугал гарызантальнага паварочвання больш за 90 градусаў і не заміналі асвятленню памяшканняў. Не менш арыгінальным на той час было і выкарыстанне цаглянай вертыкальнай устаўкі для разбіцця гарызантальных ліній будынка і надання ім асобнага кантрасту праз выкарыстанне чорна-белых будаўнічых матэрыялаў. Гэтыя і іншыя важныя ідэі архітэктара сталі асновай спачатку праектных заданняў, а потым пабудовы двух вучэбных карпусоў інстытута [24].



Фота 4. Архітэктар І. І. Есьман.



Фото 5. Вучэбны корпус МДПІЗМ (1964 г.). Аўтар І. І. Есьман.

Работы па вонкавым аздабленні і ўнутранай мадэрнізацыі вучэбных карпусоў і комплексу з актавай і спартыўнай заламі інстытута і надалей не спыняліся. Так, у пачатку 1980-х гадоў рэктаратам інстытута была ініцыравана распрацоўка архітэктурна-планіровачнага задання на выкананне праекта перахода паміж вучэбнымі карпусамі па Омскім завулку, а таксама надбудовы пятага паверха на будынак інтэрната [3, с. 220]. Аднак на той час рэалізаваць гэтыя планы не атрымалася. Новая спроба пабудовы ўстаўкі як асобнага будынка была ажыццеўлена толькі ў пачатку нулявых гадоў. У лютым 2003 г. рэктарам універсітэта Н.П. Баранавай было зацверджана заданне на праектаванне аб’екта «ўстаўкі паміж карпусамі ўніверсітэта па вул. Румянцава, 10–12» [25]. 6 сакавіка 2003 г. Мінгарвыканкам прыняў рашэнне дазволіць універсітэту правядзенне праектна-пошукавых работ па будаўніцтве будынка-ўстаўкі паміж вучэбнымі карпусамі ўніверсітэта [26].

Паводле планавага задання па гэтым аб'екце прадугледжвалася[1] будаўніцтва двухпавярховага будынка-ўстаўкі з прымыканнем да двух прылеглых вучэбных карпусоў на ўзроўні 2 і 3-га паверхаў, а таксама размяшчэннем некалькіх вучэбных памяшканняў, у тым ліку чытальнай залы, электроннай і Аўстрыйскай бібліятэк, а таксама дзвюх вучэбных аўдыторый. Але галоўным у гэтым аб'екце можна лічыць калідор-пераход, які злучыў вучэбныя карпусы і замкнуў усе будынкі ў адзіны комплекс. Нагадаем, што акт аб прыёмцы завершанага будаўніцтва і ўвядзенні ў эксплуатацыю перахода і вучэбных аўдыторый быў падпісаны 30 лістапада 2004 г. [27]. Але рэктарат універсітэта ва ўмовах пастаяннага павелічэння агульнай колькасці студэнтаў планаваў пашырыць вучэбную плошчу лінгвістычнай установы адукацыі. Пра гэта яскрава сведчыць праект (фота 6), падрыхтаваны па заданні рэктарата з улікам пабудовы новага корпуса на ўнутранай тэрыторыі ўніверсітэта. І калі рэалізацыя гэтага праекта на гэты момант не стала фактам сучаснай гісторыі, бясспрэчным доказам мэтанакіраванага ўдасканалення аўдыторнага фонду вучэбных карпусоў, комплексу актавай і спартыўнай залаў універсітэта з'яўляецца іх пастаяннае абнаўленне згодна з патрабаваннямі часу.



Фота 6. Макет вучэбнага корпуса МДЛУ (праект 2012 г.)

Такім чынам, дзякуючы стратэгічнаму планаванню кіраўніцтва інстытута (універсітэта) і творчай рэалізацыі праектных заданняў архітэктарамі «Белдзяржпраекта» і «Мінскграпраекта», у цэнтры беларускай сталіцы створаны адзін з самых сучасных комплексаў вучэбных карпусоў і збудаванняў. Гэта комплекс Мінскага дзяржаўнага лінгвістычнага ўніверсітэта, у будучым – Беларускага дзяржаўнага ўніверсітэта сусветных моў і культур.

[1] Аўтар выказвае шчырую падзяку прарэктару ўніверсітэта па адміністратыўна-гаспадарчай рабоце М. І. Тарасевічу за актыўную інфармацыйную падтрымку.

ЛІТАРАТУРА

1. *Новікаў, С. Я.* Ля вытокаў стварэння МДЛУ / С. Я. Новікаў // Вестн. МГЛУ. Сер. 3. – 2012. – № 11. – С. 219–223.
2. *Новікаў, С. Я.* «Малая зала» Мінскага іняза / С. Я. Новікаў // Вестн. МГЛУ. Сер. 3. – 2013. – № 12. – С. 230–240.
3. *Новікаў, С. Я.* Кузня лінгвістычных кадраў вышэйшай кваліфікацыі / С. Я. Новікаў // Вест. МГЛУ. Сер. 3. – 2014. – № 13. – С. 219–227.
4. Постановление № 1686 Совета Министров Белорусской ССР от 26 нояб. 1947 г. «О подготовке преподавателей иностранных языков» // НАРБ. – Ф. 7. – Воп. 3. – Спр. 270.
5. О мерах, обеспечивающих выполнение постановления Совета Министров Союза ССР № 3485 от 4 октября 1947 года «О подготовке преподавателей иностранного языка» // НАРБ. – Ф. 42. – Воп. 4. – Спр. 42.
6. Плановое задание на проектирование учебного корпуса педагогического института иностранных языков в г. Минске по ул. Захарова // Беларускі дзяржаўны архіў навукова-тэхнічнай дакументацыі (далей – БДАНТД). – Ф. 3. – Воп. 3. – Спр. 1161.
7. Плановое задание на привязку типового проекта общежития на 400 человек по Омскому переулку в г. Минске // БДАНТД. – Ф. 3. – Воп. 3. – Спр. 1161.
8. Пояснительная записка к проектному заданию по проектированию здания института иностранных языков в г. Минске // БДАНТД. – Ф. 3. – Воп. 3. – Спр. 1161.
9. Заборский Георгий Владимирович [Электронны рэсурс]. – Рэжым доступу : https://ru.wikipedia. org/wiki. – Дата доступу : 31.01.2017.
10. Плановое задание на привязку типового проекта Индустриального техникума на 840 человек (фронтальное решение) для учебного корпуса института иностранных языков по ул. Захарова в г. Минске // БДАНТД. – Ф. 10. – Воп. 3. – Спр. 362.
11. Проект вертикальной планировки и благоустройства территории Института иностранных языков по ул. Захарова в г. Минске // БДАНТД. – Ф. 10. – Воп. 2. – Спр. 367.
12. Архитектурно-проектное задание на проектирование здания для педагогического института иностранных языков по ул. Захарова в г. Минске // БДАНТД. – Ф. 10. – Воп. 3. – Спр. 362.
13. Выписка из решения Исполкома Минского городского совета депутатов трудящихся № 112 от 16 марта 1961 г. «О предоставлении земельных участков организациям и предприятиям г. Минска под жилищное и другие виды строительства» // БДАНТД. – Ф. 10. – Воп. 1. – Спр. 470.
14. Проект учебного корпуса института иностранных языков по ул. Захарова в г. Минске. Кн. 1 : Архитектурно-строительная часть // БДАНТД. – Ф. 10. – Воп. 1. – Спр. 1474.
15. Плановое задание на пристройку учебного корпуса Минского педагогического института иностранных языков // БДАНТД. – Ф. 10. – Воп. 1. – Спр. 1470.

16. Архитектор, дизайнер, изобретатель [Электронны рэсурс]. – Рэжым доступу : http://bsa.by/personalii/arhitektor-dizayner-i-izobretatel.html. – Дата доступу : 02.02.2017.
17. Генплан института иностранных языков от 12.05.1962 г. // БДАНТД. – Ф. 10. – Воп. 1. – Спр. 1469.
18. Генплан института иностранных языков 1962 г. // БДАНТД. – Ф. 10. – Воп. 1. – Спр. 1472.
19. Проектное задание института иностранных языков по ул. Захарова в г. Минске. Генеральный план: планировочное решение. 1962 г. // БДАНТД. – Ф. 10. – Воп. 189. – Спр. 1470.
20. Учебный корпус Минского педагогического института иностранных языков по Войсковому переулку. Рабочие чертежи. Кн. 1 : Архитектурно-строительная часть // БДАНТД. – Ф. 10. – Воп. 1. – Спр. 1480.
21. Протоколы партийных собраний: Отчет партбюро Минского государственного педагогического института иностранных языков за период с 16 сент. 1965 г. по 12 окт. 1966 г. // НАРБ. – Ф. 1154. – Воп. 2. – Спр. 41.
22. Комплекс актового и спортивного залов института иностранных языков по ул. Захарова. Рабочий проект : Архитектурно-строительная часть. Пояснительная записка. 1968 г. // БДАНТД. – Ф. 10. – Воп. 1. – Спр. 2272.
23. Комплекс актового и спортивного залов института иностранных языков по ул. Захарова. Рабочий проект : Кинотехнология. 1968 г. // БДАНТД. – Ф. 10. – Воп. 1. – Спр. 2276.
24. Інтэрв'ю з архітэктарам І. І. Есьманам 02.02.2017 г. // Асабісты архіў С. Я. Новікава.
25. Задание на проектирование объекта «Вставка между корпусами учреждения образования «Минский государственный лингвистический университет» по ул. П. Румянцева от 18 февр. 2003 г. // Бягучы архіў прарэктара ўніверсітэта па адміністрацыйна-гаспадарчай рабоце М. І. Тарасевіча.
26. Выписка из решения Мингорисполкома № 291 от 06.03.2003 г. «О производстве проектно-изыскательских работ организациями и предприятиями г. Минска под жилищное и другие виды строительства» // Бягучы архіў прарэктара ўніверсітэта па адміністрацыйна-гаспадарчай рабоце М. І. Тарасевіча.
27. Акт приемки объекта законченного строительства от 30.11.2004 г. // Бягучы архіў прарэктара ўніверсітэта па адміністрацыйна-гаспадарчай рабоце М. І. Тарасевіча.

*Поступила в редакцию 21.02.17*